УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# Д а в е д к і
**другога этапу (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па беларускай мове і літаратуры</u>**
**для вучняў IX, X, XI класаў устаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2015/2016 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2015

Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды праводзіцца ў 3 туры (два – у пісьмовай форме і адзін – у вуснай) па асобных заданнях для IX, X, XI класаў. Працягласць тураў для ўсіх класаў складае 6 гадзін: напісанне водгуку – не больш за 2,5 гадзіны; комплексная работа па беларускай мове і літаратуры – не больш за 2 гадзіны; вуснае выказванне – на падрыхтоўку кожнаму ўдзельніку да 20 хвілін, на адказ – да 5-7 хвілін.

Удзельнікам другога этапу ва ўсіх класах для вуснага выказвання прапануюцца білеты, у склад якіх уваходзяць дзве тэмы. Удзельнік выцягвае білет і выбірае адну з дзвюх прапанаваных тэм.

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры выконваецца на аркушах, дзе змешчаны заданні. Перад пачаткам правядзення комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры, а потым перад водгукам запаўняюцца бланкі асабістых картак, на якіх змяшчаецца шыфр удзельніка.

**Пры выкананні заданняў комплекснай работы па беларускай мове і літаратуры за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

Падчас ацэнкі водгуку і вуснага выказвання карыстацца строга крытэрыямі, якія дадаюцца.

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

## IX клас

## ДАВЕДКІ

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **9** | **5** | **6** | **5** | **4** | **5** | **3** | **5** | **3** | **50** |

**За кожную дапушчаную памылку ў комплекснай рабоце па беларускай мове і літаратуры здымаецца 0,2 бала.**

**Падчас праверкі карыстацца “Слоўнікам беларускай мовы” (2012) пад рэдакцыяй А.А. Лукашанца.**

### Заданне 1

*Максімальная колькасць балаў – **5.***

1) ч – качка,
2) дж – дождж,
3) д – падчарка,
4) т – дыспетчар,
5) ц – Ніцшэ.

### Заданне 2

*За кожную памылку **-0,2 бала**.*

Ён быў Падарожнік з вялікай літары.

Ён валодаў талентам падарожжа. Ніводнага не ведаю, хто мог бы параўнацца з ім у гэтым таленце.

Ён не сціраў белыя плямы на геаграфічных картах. Ён стараўся, каб не было белых плямаў у нашай памяці і свядомасці. Ім кіравала натхнёнасць, якая вырасла з самай вялікай любові — з любові да народа, да роднае зямлі.

Ён любіў паляванне, умеў спрытна закінуць вуду – праўда, пазней ён адмовіўся ад гэтых мужчынскіх забаў: не мог нішчыць жывое, – а вогнішча распальваў з віртуознасцю заўзятага турыста.

Ды куды тым турыстам... Ніколі ён не падарожнічаў, каб наматляць на спідометр рэкордныя кіламетры, дзеля забавы скарыць горную вяршыню, здзівіцца нязвыкламу краявіду. Так, ён узбіраўся на Крымскія горы, вандраваў па Далёкім Усходзе, выходзіў у Чорнае мора лавіць кефаль, блукаў па старажытных расійскіх гарадах, сам-насам быў з Бухарой і Самаркандам.

Але галоўным яго падарожжам праз усё жыццё было вандраванне па Беларусі. Родныя шляхі і сцяжыны вывучаў падрабязна, грунтоўна. Ён хадзіў і ездзіў па іх рэгулярна і ненатольна, не ведаючы стомы. Чаму і стаў такім.

### Заданне 3

1) е; 2) ж; 3) д; 4) а; 5) в; 6) і; 7) з; 8) ё; 9) г; 10) б.

### Заданне 4

| | Прыслоўе | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| паваліць | напавал | прыставачна-бяссуфіксны |
| свой | па-свойму | прыставачна-суфіксальны |
| летась | залетась | прыставачны |
| дзве | удзвюх | прыставачна-суфіксальны |
| завочны | завочна | суфіксальны |
| канец | - | - |

**Заданне 5**

Разводзіце, гародзіце, круціце, араце, звоніце, мелеце, таўчаце, правіце, пераліваеце, плецяце.

**Заданне 6**

Афрыканская жырафа, скураны туфель, шэрае вараняня (варанянё), звонкі капыт, вузкае шво, вясёлая гусь, абрыдлая блыха, пругкі рэмень.

**Заданне 7**

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

Вучыцца ніколі не позна. (*Дзейнік.*)
Цяпер мне хацелася вучыцца. (*Выказнік.*)
Бацькі ўвесь час казалі мне добра вучыцца. (*Дапаўненне.*)
Жаданне вучыцца не пакідала Уладзіміра Караткевіча ніколі. (*Азначэнне.*)
У 1909 годзе Янка Купала паехаў вучыцца ў Пецярбург. (*Акалічнасць.*)

**Заданне 8**

У тэксце распавядаецца пра Уладзіміра Караткевіча, аўтара кнігі нарысаў “Зямля пад белымі крыламі”, якая спярша пісалася для ўкраінскіх старшакласнікаў і была выдадзена на ўкраінскай мове ў Кіеве ў 1972 годзе.

**Заданне 9**

1. Праблема.
2. Эпітэт.
3. Паданне.
4. Паралелізм.
5. Паліндром.

**Заданне 10**

1. Данута Бічэль. Роднае слова.
2. Янка Купала. Спадчына.
3. Кандрат Крапіва. Ганарысты парсюк.

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

## X клас

## ДАВЕДКІ

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **6** | **10** | **5** | **4** | **4** | **3** | **5** | **3** | **5** | **5** | **50** |

**За кожную дапушчаную памылку ў комплекснай рабоце па беларускай мове і літаратуры здымаецца 0,2 бала.**

**Падчас праверкі карыстацца "Слоўнікам беларускай мовы" (2012) пад рэдакцыяй А.А. Лукашанца.**

### Заданне 1

*Максімальная колькасць балаў – **6***
*(за кожны правільна названы гук – **0,5 бала**,*
*за кожную пазіцыю гука – **0,5 бала**).*

1. [і] – 1) пасля мяккага зычнага: *сальніца, даць інструмент*;
2) на пачатку слова, калі папярэдняе заканчваецца на [г], [к], [х]: *пернік імбірны*;
3) калі [і] – прыстаўны: *іржа*.
2. [й’і] – 1) пад націскам на пачатку слова: *Індыя*;
2) у сярэдзіне слова пасля галосных, ў, ь, апострафа: *краіна, аб здароўі, аб’інець, Ільіч*.
3. [й] – на пачатку слова, калі папярэдняе заканчваецца на галосны: *сыплецца ігліца, бацька і маці*.
4. [ы] – 1) на пачатку слова, калі папярэдняе заканчваецца на цвёрды зычны: *перад іспытамі, сад і агарод*;
2) у складаных словах, першая частка якіх заканчваецца на цвёрды зычны: *бортінжынер*.

### Заданне 2

*За кожную памылку **-0,2 бала**.*

Моцныя і цёплыя сувязі ядналі пісьменніка са старэйшай сястрой Наталляй. У вершы, напісаным <u>дваццатага</u> лістапада <u>тысяча дзевяцьсот восемдзесят другога</u> года да яе <u>шасцідзесяцігоддзя</u>, ён зычыў сястры і яе сям’і ўсяго самага найлепшага ў жыцці, называў яе сваёй дарагой нянькай, сваёй абаронцай у бядзе, марыў пра той час, калі яны абое некалі сядуць на прызбу і згадаюць пражытыя гады, успомняць Оршу, «*тую, зялёную, бег крыніц ля Дняпра-ракі, і ўральскія эшалоны, і ў цяплушках салдатаў палкі*». У брата і сястры было шчаслівае даваеннае дзяцінства. Потым прыйшлі суровыя выпрабаванні ваеннага часу, а пасля — радасці і турботы мірнага жыцця.

Часцейшымі сталі сустрэчы брата і сястры пасля таго, як у <u>тысяча дзевяцьсот семдзесят першым</u> годзе Наталля Сямёнаўна пераехала з сям’ёй на сталае жыхарства ў Мінск. Шчырай дарадчыцай і памочніцай была яна для пісьменніка ў апошнія гады ягонага жыцця, асабліва калі не стала братавай жонкі.

*За знойдзеную памылку – **1 бал**,*
*за правільнае тлумачэнне – **1 бал**.*

Памылка: *самага найлепшага*.

Правільна *найлепшага*, бо складаная форма найвышэйшай ступені параўнання ўтвараецца спалучэннем пачатковай формы прыметніка са словам самы.

### Заданне 3

Альма-матар, атракцыён, белетрыстыка, гросмайстар, маянэз, імпрэсарыа, асэсар, ноу-хау, абрэвіятура, рэзюмэ.

**Заданне 4**

Адвербіялізацыя – пераход іншых часцін мовы ў прыслоўі.

*Якое раздолле ў зялёным бары летам!*

Ад’ектывацыя – пераход іншых часцін мовы ў прыметнікі.

*Надоечы чуў, як гаючая крынічная вада дапамагла аднаму чалавеку акрыяць.*

Пранаміналізацыя – пераход іншых часцін мовы ў займеннікі.

*Сам не гам і другому не дам.*

Субстантывацыя – пераход іншых часцін мовы ў назоўнікі.

*Паранены прыўзняў галаву, каб зрабіць глыток.*

**Заданне 5**

| Фразеалагізм | Слова-антонім |
|---|---|
| У кожнай кішэні па жмені | мала |
| Хоць сабак вешай | нізкі |
| Выводзіць на белы свет | утойваць |
| Глядзець знізу ўверх | пагарджаць |
| Дзе Макар козы пасвіць | блізка |
| Без цара ў галаве | разумны |
| Грэць лоб | лайдачыць |
| Хоць на сабаку вылі | смачны |

**Заданне 6**

*За правільнае скланенне лічэбніка –* ***1 бал****,*
*за разрад і правільнае тлумачэнне –* ***па 1 бале****.*

Н. абое.
Р. абаіх.
Д. абаім.
В. абаіх.
Т. абаімі.
М. (пры) абаіх.

Зборны лічэбнік *абое* ўжываецца, калі гутарка ідзе пра асоб мужчынскага і жаночага полу.

**Заданне 7**

| | |
|---|---|
| Высеяць (высеяце, высееце, высеіце) | высееце |
| Сыпаць (сыплюць, сыпяць, сыпюць) | сыплюць |
| Гусці (гудзіць, гусе, гудзе) | гудзе |
| Малоць (мялю, малю, малачу) | мялю |
| Сцерці (сцераце, сатроце, сатраце) | сатраце |
| Засячы (засякеш, засячэш, засячош) | засячэш |
| Адпачыць (адпачываем, адпачым, адпачнём) | адпачнём |
| Свішчуць (свістаць, свісцець, свіснуць) | свістаць |
| Угледзець (угледзіў, углядзеў, угледзеў) | угледзеў |
| Гаварыць (гаворылі, гаварылі, гаворілі) | гаварылі |

**Заданне 8**

У тэксце ідзе размова пра Уладзіміра Караткевіча, які прысвяціў маці два свае галоўныя творы: першы зборнік вершаў “Матчына душа” і раман “Каласы пад сярпом тваім”.

**Заданне 9**

1. Акраверш.
2. Аксюмаран (аксімаран).
3. Трыялет.
4. Дактыль.
5. Алітарацыя.

**Заданне 10**

| Гістарычная падзея, факт | Аўтар | Твор |
|---|---|---|
| паўстанне 1863-1864 гадоў | Уладзімір Караткевіч | “Паром на бурнай рацэ” |
| Другая сусветная вайна | Васіль Быкаў | “Незагойная рана” |
| паўстанне 1863-1864 гадоў | Кастусь Каліноўскі | “Пісьмо з-пад шыбеніцы” |
| Першая сусветная вайна | Максім Гарэцкі | “Літоўскі хутарок” |
| Другая сусветная вайна | Васіль Быкаў | “Жураўліны крык” |
| аварыя на Чарнобыльскай АЭС | Іван Пташнікаў | “Ільвы” |
| Другая сусветная вайна | Уладзімір Караткевіч | “Лісце каштанаў” |

*Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды*
*<u>па беларускай мове і літаратуры</u>*

# Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

## XI клас

## ДАВЕДКІ

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **6** | **8** | **3** | **6** | **5** | **5** | **4** | **4** | **6** | **3** | **50** |

**За кожную дапушчаную памылку ў комплекснай рабоце па беларускай мове і літаратуры здымаецца 0,2 бала.**

**Падчас праверкі карыстацца "Слоўнікам беларускай мовы" (2012) пад рэдакцыяй А.А. Лукашанца.**

### Заданне 1

1. Спалучэнні зычных **зч, жч** вымаўляюцца як [шч], напрыклад: *рэзчык, мужчына.*
2. Спалучэнні зычных **шс, жс** вымаўляюцца як [с], [с'], напрыклад: *латышскі, нясвіжскі, імкнешся.*
3. Спалучэнні зычных **дч, тч** вымаўляюцца як [ч̑], напрыклад: *даследчык, матчын.*
4. Спалучэнні зычных **тц, чц** вымаўляюцца як [ц̑], напрыклад: *нататцы, свечцы.*

### Заданне 2

*За кожную памылку **-0,2 бала.***

Ён прыйшоў прыгадаць і паказаць Беларусь, распавесці пра яе.

Гэта, насамрэч, была яго Беларусь, але яна паступова ўваходзіла ў нашу душу, станавілася таксама і нашай Беларуссю. Як нашымі сябрамі, праваднікамі па сваёй зямлі станавіліся і «дзеці» пісьменніка, героі яго твораў...

Мы разам з Раманам Ракутовічам, няскораным і абязручаным, пяшчотна абдымаем акрываўленымі цурбалкамі каханую, пазбаўленую зроку Ірыну — сваю родную зямлю («Сівая легенда»).

Мы разам з Андрэем Беларэцкім знаходзім паратунак ад цёмных, вераломных сіл для запужанай і амаль пазбаўленай надзеі на далейшае існаванне Надзеі Яноўскай — сваёй роднай зямлі («<u>Дзікае паляванне караля Стаха</u>»).

Мы разам з Гервасіем Вылівахам блукаем па царстве Аіда і гуляем са Смерцю ў шахматы, а нам дапамагае незгасальнае святло шыпшыны і прамяністы позірк Бярозкі — сімвалаў сваёй роднай зямлі («<u>Ладдзя Роспачы</u>»).

Мы разам з Андрэем Рогачам праз пакуты і выпрабаванні вяртаем да жыцця сваю д'ябальскую душу, знаходзячы, страчваючы і зноў адшукваючы Дубраўку — сваю родную зямлю («Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны...»).

Мы разам з Васілём Ветрам накіроўваемся ў пячору да пракажонага, каб усвядоміць адказнасць перад Чалавекам, перад сваёй роднай маці-зямлёй («Маці ўрагану»).

Мы разам з Юрасём Братчыкам пачынаем разумець, што дзеля праўды павінны быць усвядомленыя перакананні і моцная воля, што, у рэшце рэшт, урабляць ніву, даваць ёй магчымасць радзіць — гэта і ёсць найвышэйшае прызначэнне Чалавека на роднай зямлі («Хрыстос прызямліўся ў Гародні»).

Мы разам з Петраком Ясюкевічам, прыносячы шчасце іншым народам, ратуючы ў пясках Сахары маленькі камячок жывой плоці, Джамілю, марым вярнуцца да сваёй пакрыўджанай, здратаванай і акрываўленай, але ўсё ж самай прыгожай роднай зямлі («Сіняя-сіняя...»).

Мы разам з Алесем Загорскім і Кастусём Каліноўскім бачым «на кожным раздарожжы, над усёй краінай узлёт прабітых цвікамі рук» і змагаемся за праўду і справядлівасць, перакананыя, што «не трэба тысячы, каб пачаць» здабываць волю для сваёй роднай зямлі («<u>Каласы пад сярпом тваім</u>»).

Мы разам з Севярынам Будрысам знаходзім сваю чазенію — Гражыну Арсайлу, сімвал гармоніі, і страчваем яе, і ўсё ж спадзяёмся на блізкую сустрэчу з ёй — сваёй вялікай зямлёй, радзімай чалавецтва («<u>Чазенія</u>»).

Мы разам з Антонам Космічам набліжаемся да разумення таго, што без радзімы мы нічога не варты: «*Край мой! Родная мая зямля! Як жа мне жыць, калі я пайду з цябе? Як мне быць, калі я памру і, можа, быццё маё яшчэ некаторы час не скончыцца — і гэта й ёсць абяцанае мне пекла? Без цябе*» («Чорны замак Альшанскі»).

**Заданне 3**

| Фразеалагізмы | Якасці чалавека |
|---|---|
| гарачая галава | нястрыманасць |
| дзіравая галава | рассеянасць, няпамятлівасць |
| галава на плячах | кемлівасць |
| сам сабе галава | самастойнасць, незалежнасць |
| з ветрам у галаве | легкадумнасць |
| хоць кол на галаве чашы | упартасць |

**Заданне 4**

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Неалагізмы | Ад якіх слоў утварыліся | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| паняньkаваць | нянька | прыставачна-суфіксальны |
| харашыць | харошы | суфіксальны |
| грыбазбір | грыбы, збіраць | складана-нульсуфіксальны |
| трываліцца | трывалы | суфіксальна-постфіксальны |

**Заданне 5**

| | Беларускі адпаведнік з тэксту | Часціна мовы |
|---|---|---|
| осознанный | усвядомлены | дзеепрыметнік |
| почти | амаль | часціца |
| шиповник | шыпшына | назоўнік |
| спасая | ратуючы | дзеепрыслоўе |
| ради | дзеля | прыназоўнік |

**Заданне 6**

Мальба, коней, бярвён, чарніла, госцяў (госцей), зяцёў, рунь, броваў (брывоў), прыцемкаў, грошай.

**Заданне 7**

1. Акалічнасць.
2. Дапаўненне.
3. Выказнік.
4. Дзейнік.

**Заданне 8**

*За правільна названы прыём – **1 бал**,*
*за астатнія правільныя адказы – па **0,5 бала**.*

У аснове тэксту, дзе ўзгадваюцца персанажы і творы Уладзіміра Караткевіча, ляжыць прыём сінтаксічнага паралелізму.

## Заданне 9

*За правільна названага пісьменніка – **0,5 бала**,*
*за кожнае тлумачэнне – **1 бал.***

1. У гэтым доме жыў Адам Міцкевіч. Быў ахрышчаны ў Фарным касцёле. Прырода, гісторыя, фальклор Навагрудчыны сфармавалі рамантычны талент паэта.

2. Максім Танк нарадзіўся на Мядзельшчыне, там жа ў даваенны час жыў і працаваў.

3. Недалёка ад Мікалаеўшчыны нарадзіўся Якуб Колас і ў ваколіцах мястэчка правёў дзіцячыя і юнацкія гады. Вучыўся ў народнай вучэльні Мікалаеўшчыны. У вёсцы адбыўся першы нелегальны настаўніцкі з’езд, адным з арганізатараў якога быў паэт. Пасля зняволення за гэта Якуб Колас жыў і працаваў пад Мікалаеўшчынай, тут упершыню сустрэўся з Янкам Купалам, напісаў свае галоўныя творы.

4. У сярэдзіне XVI ст. ў Нясвіжы заснавана друкарня для выпуску пратэстанцкай літаратуры, дзе друкаваў беларускія кнігі Сымон Будны.

## Заданне 10

1. Паданне.
2. Элегія.
3. Вадэвіль.
4. Жыціе.
5. Нарыс.
6. Балада.

*Другі этап (раённы, гарадскі) Рэспубліканскай алімпіяды*
*<u>па беларускай мове і літаратуры</u>*

**IX, X, XI класы**

**Крытэрыі ацэнкі конкурсу “Водгук на мастацкі твор”**

*Максімальная колькасць балаў –**30***

| | |
|---|---|
| **I. УМЕННЕ ВЫЯЎЛЯЦЬ АСНОЎНУЮ ТЭМАТЫКУ І ПРАБЛЕМАТЫКУ ТВОРА, АЎТАРСКУЮ ПАЗІЦЫЮ (2 балы)** | |
| 2 балы | *Правільнае разуменне тэмы і праблемы твора, дакладнае вызначэнне і абгрунтаванне аўтарскай пазіцыі* |
| 1 бал | *Няпоўнае разуменне тэмы і праблемы твора, недастаткова поўнае асвятленне аўтарскай пазіцыі* |
| 0,5 бала | *Прыблізнае разуменне тэмы і праблемы твора, выяўленне асобных спосабаў раскрыцця аўтарскай пазіцыі* |
| **II. УМЕННЕ АБГРУНТОЎВАЦЬ ПРАЧЫТАНАЕ (6 балаў)** | |
| 6 балаў | *Дакладнае і вычарпальнае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора; наяўнасць чытацкага вопыту (звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, уласныя паэтычныя радкі, цытаты і інш.); дарэчнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, яго дакладнасць, доказнасць, мэтазгоднасць, эфектыўнасць* |
| 4-5 балаў | *Наяўнасць цікавых назіранняў над творам, пэўнага чытацкага вопыту, эпізадычнае абгрунтаванне уласных высноў са спасылкай на тэкст і творы іншых аўтараў* |
| 3 балы | *Ацэнка асобных (2-3) аўтарскіх перакананняў, думак, разважанняў; частковае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора* |
| 2 балы | *Наяўнасць асобных цікавых назіранняў над творам без прывядзення неабходнай аргументацыі* |
| 1 бал | *Канстатацыя арыгінальнасці прачытанага, але адсутнасць доказаў, наяўнасць фактычных, лагічных памылак у аргументацыйнай частцы, абмежаваны чытацкі вопыт, недакладнасць, спрошчанасць асабістай ацэнкі, пераказ зместу твора, недарэчнае цытаванне твораў вядомых аўтараў* |
| **III. УМЕННЕ ВЫЗНАЧАЦЬ РОЛЮ СЮЖЭТА, КАМПАЗІЦЫІ, ВЫЯЎЛЕНЧЫХ СРОДКАЎ ВЫРАЗНАСЦІ (7 балаў)** | |
| 7 балаў | *Дакладнае вызначэнне кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці і іх цікавая інтэрпрэтацыя* |
| 5-6 балаў | *Нязначныя недахопы ў інтэрпрэтацыі вобразных сродкаў і структуры тэксту* |
| 4 балы | *Наяўнасць нешматлікіх (1-2) памылак у вызначэнні і інтэрпрэтацыі кампазіцыі твора, сюжэтных ліній, вобразаў, выяўленчых сродкаў* |
| 3 балы | *Інтэрпрэтацыя асобных элементаў тэксту* |
| 2 балы | *Павярхоўнае бачанне ролі сюжэта, кампазіцыі, вобразаў, мастацкіх* |

| | |
|---|---|
| | *сродкаў выразнасці ў раскрыцці тэмы і ідэі твора; недакладнасці ў вызначэннях* |
| 1 бал | *Пералічэнне выяўленчых сродкаў без абгрунтавання іх ролі ў мастацкім творы* |
| **IV. МОЎНАЕ І КАМПАЗІЦЫЙНАЕ АФАРМЛЕННЕ ВОДГУКУ (3 балы)** | |
| 3 балы | *Прадуманасць кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення), багацце, разнастайнасць моўных сродкаў, дакладнасць словаўжывання* |
| 2 балы | *Нязначныя парушэнні кампазіцыйных частак, асобныя недахопы моўнага выражэння* |
| 1 бал | *Парушэнне жанравай цэласнасці водгуку, яго структурных (адсутнасць уступу або заключэння) і стылістычных патрабаванняў; парушэнне лагічнай сувязі кампазіцыйных частак, іх несувымернасць; недахопы моўнага выражэння (беднасць слоўнікавага запасу, русізмы, калькі, моўныя штампы)* |
| **V. ПІСЬМЕННАСЦЬ (10 балаў)**<br>па крытэрыях ацэнкі творчых работ вучняў | |
| 1 бал | Больш як на 2 балы |
| 2 балы | ад 7/2 да 10/1 і 10 граматычных памылак |
| 3 балы | 0/8, 1/7, 2/6, 3/5, 4/4, 5/3, 6/2, 7/1 і 7 граматычных памылак |
| 4 балы | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/0, 6/1 і 6 граматычных памылак |
| 5 балаў | 0/6, 1/5, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і 5 граматычных памылак |
| 6 балаў | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і 4 граматычныя памылкі |
| 7 балаў | 0/4, 1/3, 2/1, 2/2, 3/0, 3/1 і 3 граматычныя памылкі |
| 8 балаў | 2/0, 1/1, 1/2, 0/2, 0/3 і 2 граматычныя памылкі або 3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 9 балаў | 1/0, 0/1 і 1 граматычная памылка або 1-2 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 10 балаў | 0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (пягрубая), 1-2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| **VI. ТВОРЧЫ ХАРАКТАР РАБОТЫ (2 балы)** | |
| 2 балы | *Арыгінальнасць трактоўкі, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; дакладнасць, навуковы кругагляд, наяўнасць нестандартнай формы, яе мэтазгоднасць, эфектыўнасць пры дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач* |
| 1 бал | *наяўнасць асобнага(ых) цікавага(ых) назірання(яў), гісторыка-культурных параўнанняў, паралеляў з іншымі творамі; спрошчанасць, традыцыйнасць высноў, немэтазгоднасць абраных сродкаў і формы для вырашэння пастаўленых камунікатыўных задач* |

**Крытэрыі ацэнкі конкурсу "Вуснае выказванне"**

*Максімальная колькасць балаў* – **20**

| | |
|---|---|
| **I. АДПАВЕДНАСЦЬ ВЫКАЗВАННЯ АБРАНАЙ ТЭМЕ (6 балаў)** | |
| 6 балаў | *Поўная адпаведнасць паміж абранай тэмай і зместам выказвання* |
| 5 балаў | *Правільнае разуменне тэмы, але нязначныя недакладнасці ў яе раскрыцці* |
| 4 балы | *Правільнае разуменне тэмы, але няпоўнае яе раскрыццё* |
| 3 балы | *Павярхоўнае разуменне і раскрыццё тэмы* |
| 2 балы | *Павярхоўнае разуменне тэмы, неадпаведнасць зместу выказвання* |
| 1 бал | *Значная неадпаведнасць зместу выказвання* |
| **II. ЛАГІЧНАСЦЬ І БУДОВА ВЫКАЗВАННЯ (5 балаў)** | |
| **Уступ (1 бал)** | |
| 1 бал | *Адпаведнасць тэме, арыгінальнасць, уменне прыцягнуць увагу слухачоў* |
| 0,5 бала | *Невыразнасць, парушэнне памераў (зацягнутасць, трафарэтнасць)* |
| 0 балаў | *Адсутнасць уступных фраз* |
| **Асноўная частка (3 балы)** | |
| 3 балы | *Мэтазгодная сувязь частак, лагічнасць думак, пераканальнасць, выкарыстанне канкрэтных прыкладаў, цытат, аргументацыя і доказнасць выкладу* |
| 2 балы | *Нязначныя адхіленні ў разгортванні асноўнай часткі і яе змястоўнасці* |
| 1 бал | *Парушэнне паслядоўнасці выкладу, лагічнасці, змястоўнасці, недастатковасць аргументаў, недарэчнасць прыкладаў, цытат* |
| 0 балаў | *Адсутнасць аргументаў, цытат, спасылак* |
| **Заключэнне (1 бал)** | |
| 1 бал | *Кароткае абагульненне ідэй і меркаванняў, якія выражаюць задуму выказвання* |
| 0,5 бала | *Невыразнасць заключных фраз, парушэнне памераў, лозунгавасць* |
| 0 балаў | *Адсутнасць заключнай часткі (вывадаў).* |
| **III. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ (6 балаў)** | |
| **Захаванне нормаў (лексічных, граматычных, арфаэпічных) - 2 балы** | |
| 2 балы | *Адсутнасць парушэнняў або нязначныя парушэнні (2-3)* |
| 1 бал | *Парушэнні нормаў (4-8 памылак)* |
| 0 балаў | *Грубыя парушэнні нормаў (больш за 8 памылак)* |
| **Чысціня маўлення - 2 балы** | |
| 2 балы | *Захаванне стылёвага адзінства, адсутнасць адступленняў ад літаратурнай мовы* |
| 1 бал | *Наяўнасць нязначных парушэнняў стылёвага адзінства (да 3)* |
| 0 балаў | *Парушэнне стылёвай адпаведнасці (русізмы, паланізмы, дыялектызмы) (больш за 3)* |
| **Багацце маўлення (выкарыстанне сродкаў выразнасці) - 2 балы** | |
| 2 балы | *Багацце слоўніка, разнатыпнасць канструкцый, дарэчнае выкарыстанне моўных сродкаў выразнасці* |
| 1,5 бала | *Пэўная наяўнасць разнатыпных сінтаксічных канструкцый, эпізадычнае выкарыстанне моўных сродкаў выразнасці* |

| | |
|---|---|
| 1 бал | *Аднастайнасць слоўніка, таўталогія, аднатыпнасць канструкцый, адсутнасць сродкаў выразнасці* |
| 0,5 бала | *Беднасць слоўніка, прымітыўнасць фраз, аднатыпнасць канструкцый* |
| **IV. ДАСКАНАЛАСЦЬ ПРАМАЎЛЕННЯ<br>(3 балы)** | |
| **Выразнасць -1 бал** | |
| 1 бал | Выказванне выразнае, адсутнасць манатоннасці прамаўлення |
| 0,5 б. | Выказванне невыразнае, манатоннае, назіраецца абыякавасць |
| **Уменне трымацца перад слухачамі - 1 бал** | |
| 1 бал | Натуральнасць манеры, апраўданы артыстызм |
| 0,5 б. | Неапраўданае акцёрства, бязадраснасць, пафаснасць |
| **Інтанацыя (паўзы, лагічны, слоўны і фразавы націскі, мелодыка) - 1 бал** | |
| 1 бал | Наяўнасць паўз, лагічных націскаў |
| 0,5 б. | Парушэнне рытму, тэмпу прамаўлення, адсутнасць лагічных паўз |